Масква, Крэмль,

# Іосіфу Вісарыёнавічу СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

З найвялікшым лікаваннем успрыняў беларускі народ вестку аб перамозе слаўных совецкіх армій, кіруемых Вамі ў Вялікай Айчыннай вайне. Разгром гітлераўскай Германіі, поўная і безагаворачная яе капітуляцыя—гэта сусветна гістарычная перамога ўвойдзе ў вякі, як апафеоз вялікай вызваленчай барацьбы совецкага народа і таржаства нашай справядлівай справы. Гэтая перамога азначае канец разбойніцкім нашэсцям на ўсход нямецкіх мілітарыстаў, якія прыносілі незлічоныя пакуты і беды беларускаму народу. На працягу апошніх трох дзесяцігоддзяў беларускі народ тройчы падвяргаўся разбойніцкім набегам германскіх захопнікаў.

Па Вашаму закліку, дарагі таварыш Сталін, у гэтую Вялікую Айчынную вайну беларускі народ узняўся на свяшчэнную бітву супроць сваіх спрадвечных ворагаў—нямецкіх прыгнятальнікаў. Ні варварскія разбурэнні гарадоў, ні масавае знішчэнне мірнага насельніцтва, ні ўгон тысяч людзей у нямецкае рабства не зламалі волю свабодалюбівага беларускага народа. Сотні тысяч беларусоў змагаліся ў радах Чырвонай Арміі і ў партызанскіх атрадах супроць нямецкіх захопнікаў.

Пры брацкай дапамозе ўсіх народаў Совецкага Саюза, дзякуючы намаганням герaічнай Чырвонай Арміі, беларуская зямля была вызвалена ад нямецкіх захопнікаў.

Дарагі таварыш Сталін!

Яшчэ ў пачатку вайны Вы сказалі:

«Наша справа справядлівая, перамога будзе за намі!»

Вашы прароцкія словы поўнасцю здзейсніліся. Наша доблесная Чырвоная Армія, кіруемая Вамі, вызваліла ўсю совецкую зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, узняла сцяг перамогі над

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.

Старшыня Совета Народных Камісараў Беларускай ССР П. ПАНАМАРЭНКА.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі Н. КІСЯЛЁЎ.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ